Studia z Filologii Polskiej i Słowiańskiej, 59
Warszawa 2024
Article No. 3239

Citation:

Шклярык, В. (2024). Два малавядомыя лацінаграфічныя тэксты з рукапісу XVIII ст.: Спроба моўнай праекцыі на дыялектны ландшафт усходняй часткі Рэчы Паспалітай. *Studia z Filologii Polskiej i Słowiańskiej*, *59*, Article 3239. https://doi.org/10.11649/sfps.3239

Shkliaryk, V. (2024). Dva malaviadomyia latsinahrafichnyia tėksty z rukapisu XVIII st.: Sproba moŭnaĭ praektsyi na dyialektny landshaft uskhodniaĭ chastki Rėchy Paspalitaĭ. *Studia z Filologii Polskiej i Słowiańskiej*, *59*, Article 3239. https://doi.org/10.11649/sfps.3239

DOI: 10.11649/sfps.3239

Вадзім Шклярык
(Інстытут славістыкі Польскай акадэміі навук, Варшава)

Два малавядомыя лацінаграфічныя тэксты з рукапісу XVIII ст.: спроба моўнай праекцыі на дыялектны ландшафт усходняй часткі Рэчы Паспалітай

Уступ

Даследчая ўвага да XVIII ст. як перыяду, у які спыніла існаванне старабеларуская літаратурна-пісьмовая мова і пачала развівацца новая беларуская літаратурная мова, на працягу першай чвэрці XXI ст. захоўвае сваю інтэнсіўнасць, што знаходзіць выражэнне ў публікацыях шэрагу аўтараў (Свістунова, 2020; Getka, 2018; Dzierżanowska, 2020 і інш.). Рэгулярную актуалізацыю пытанняў адносна перарыву або пераемнасці пісьмовай традыцыі ў гісторыі беларускай мовы забяспечваюць як новыя рукапісныя знаходкі ў бібліятэках і архівах розных краін (Брыль, 2020; Лісейчыкаў, 2016), так і зварот да ўжо вядомых, але да апошняга часу не апублікаваных (прынамсі,

This is an Open Access article distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 4.0 International License (https://creativecommons.org/licenses/by/4.0/), which permits redistribution, commercial and non-commercial, provided that the article is properly cited. © The Author(s) 2024.
Publisher: Institute of Slavic Studies, Polish Academy of Sciences
[Wydawca: Instytut Slawistyki Polskiej Akademii Nauk]

у арыгінальным выглядзе і ў поўным аб'ёме) тэкстаў (Мартысюк, 2016; Хаўстовіч, 2022). Нягледзячы на тое што моўная прыналежнасць усіх гэтых твораў застаецца дыскусійнай, іх выяўленне, публікацыя і дэталёвы аналіз уяўляюцца неабходнымі для далейшага вывучэння гісторыі беларускай мовы. Акрамя таго, грунтоўнае даследаванне такога матэрыялу будзе спрыяць актывізацыі пошукаў новых тэкстаў XVIII ст., што ў перспектыве запатрабуе стварэння адпаведнага тэкставага корпусу.

Прапанаваны артыкул прысвечаны мовазнаўчаму аналізу двух тэкстаў, выяўленых на пачатку 1970-х гадоў беларускім літаратуразнаўцам, доктарам філалагічных навук, прафесарам Адамам Мальдзісам (1932–2022) у рукапісе XVIII ст., які захоўваецца ў Бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта. Гэта запісаныя лацінскімі літарамі вершаваныя творы пад умоўнымі назвамі «Красная ў пані ўрода» і «Мілейка свого подождала»[1], згаданыя ў манаграфіі А. Мальдзіса *На скрыжаванні славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII–XVIII ст.)* (Мальдзіс, 1980, с. 93). Першы з гэтых тэкстаў у адаптаваным выглядзе і кірылічным напісанні неаднаразова ўключаўся ў анталогіі беларускай літаратуры (Гілевіч, 1993, с. 113; Чамярыцкі, 2005, с. 841; Чамярыцкі, 2012, сс. 353–354). У арыгінальным лацінаграфічным абліччы абодва творы публікуюцца ў гэтым артыкуле ўпершыню. Дапамогу ў расчытванні рукапісных тэкстаў аказалі навуковы супрацоўнік сектара камп'ютарнай лінгвістыкі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вячаслаў Мартысюк і дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Марына Свістунова.

Адрознівальныя моўныя асаблівасці тэкстаў

Тэксты змяшчаюцца ў рукапісе № 85 з фондаў Бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта (сігнатура: Rps BUW nr 85), на старонках 240–242. У выданні *Katalog rękopisów Biblioteki Uniwersyteckiej w Warszawie, T.1, nr 1–162 [Каталог рукапісаў Універсітэцкай бібліятэкі ў Варшаве, T.1, nr 1–162]* гэты рукапіс фігуруе пад апісальнай назвай *Akta i korespondencja obozu saskiego i opozycji w Polsce w latach 1702–1704 oraz miscellanea XVII i XVIII w. [Дакументы*

[1] Арыгінальныя лацінаграфічныя назвы твораў (дакладней, фразы, якімі пачынаюцца гэтыя тэксты) выглядаюць наступным чынам: *Krasnaia uPani Uroda* і *Myleyka Swoho podkała*.

і перапіска саксонскага лагера і апазіцыі ў Польшчы ў 1702–1704 гадах, а таксама рознае з XVII і XVIII ст.] (Kozerska & Stummer, 1963, c. 133). Падрабязнае апісанне зместу дакумента ва ўказаным даведніку ўтрымлівае сярод іншага наступныя звесткі:

> 6) Wiersze polskie, łacińskie i ruskie, ss. 240–245.
> Inc.: «Krasnaia u Pani uroda…», ss. 240–241 i 242.
> Inc.: «Co żem ci winien, czy godzien żem kary…», ss. 241–242.
> «Post Senatus Consilium w marcu 1699». Inc.: «Ogiński pożar litewski gasi…», s. 244.
> «Carmen cancerinum in suprae[m]um Regni caput» Inc.: «Bella fugis sequeris bellas…» i tłumaczenie polskie tegoż, ss. 244–245.
> «Paradoxa polskie» – krótkie okolicznościowe sentencje, s. 243 (Kozerska & Stummer, 1963, c. 133).

Як можна меркаваць, укладальнікі выдання *Katalog rękopisów Biblioteki Uniwersyteckiej w Warszawie* вылучылі ў складзе рукапісу № 85 толькі адзін вершаваны твор, які не з'яўляецца польскім або лацінскім («Krasnaia u Pani uroda…»), а ягоная моўная прыналежнасць вызначана як «руская»[2]. У сваю чаргу А. Мальдзіс апісвае свае знаходкі ў гэтым рукапісе[3] наступным чынам:

> дзве беларускія песні – „Красная ў пані ўрода" і „Мілейка свого подождала" (Мальдзіс, 1980, с. 93).

Трэба адзначыць, што адрозныя сюжэты і вершаваныя памеры сапраўды дазваляюць вылучыць у складзе рукапісу № 85 не адзін, а менавіта два «рускія» тэксты, як гэта зрабіў А. Мальдзіс. Але іх аднясенне даследчыкам да «беларускіх»[4] патрабуе як мінімум агаворкі, а з улікам сітуацыі з беларускай мовай у XVIII ст. – яшчэ і паўнавартаснага аналізу з акцэнтам на адрознівальныя моўныя прыкметы, у тым ліку лакальнага характару.

---

[2] Тэрмінам «рускія» ў польскай лінгвістычнай традыцыі прынята абазначаць усходнеславянскія мовы, «у прыватнасці на ранейшым этапе іх развіцця» (Polański, 1995, с. 461). Гэты ж тэрмін выкарыстоўваецца для акрэслення афіцыйнай дзяржаўнай мовы Вялікага Княства Літоўскага (Citko, 2018, с. 7) як эквівалент да прынятых у беларускім і ўкраінскім мовазнаўстве тэрмінаў «старабеларуская мова» і «старажытнаўкраінская мова».

[3] На асобным лістку, прыкладзеным да рукапісу № 85, ёсць уласнаручны запіс А. Мальдзіса наконт таго, што ён працаваў з гэтым рукапісам 20.10.1971 у рамках тэмы «Literatura Białorusi XVIII wieku».

[4] Неабходна адзначыць, што праблемнасць вызначэння моўнай прыналежнасці тэкстаў XVII–XVIII стст. А. Мальдзіс усведамляў (Мальдзіс, 1980, сс. 10–12).

Фанетыка-графічныя асаблівасці[5]**.** У галіне вакалізму звяртае на сябе ўвагу адсутнасць у тэксце № 1 літар *ą* і *ę*, што абазначаюць страчаныя ва ўсходнеславянскіх мовах насавыя галосныя. У тэксце № 2 два разы ўжыта літара *ę*, аднак у першым выпадку гэта, відаць, апіска (*sęrdenko*). Для абодвух твораў у цэлым характэрна адсутнасць акання (выключэннямі з'яўляюцца словы *chodim<u>a</u>*, *pom<u>a</u>hayb<u>a</u>k*, *pereskaźaiesz* у тэксце № 1)[6]. Акрамя таго, у тэксце № 1 знайшлі адлюстраванне такія адметныя з'явы, як ужыванне на месцы колішняга *ѣ* гукаў [і] і [ы] пад націскам (*d<u>i</u>du*, *na¦b<u>i</u>du*, *z¦d<u>y</u>da*), пераход этымалагічнага [о] у гук [у] у закрытым складзе пад націскам (*id na n<u>u</u>cz*), замена этымалагічнага [ы] гукам [у] пасля губнога зычнага (*pozb<u>u</u>ła*).

У галіне кансанантызму неабходна адзначыць адсутнасць у абодвух творах адлюстравання дзекання і цекання (выключэннем з'яўляецца слова *powo<u>dz</u>yt* у тэксце № 2). На зацвярдзелы характар зычнага [р], прынамсі ў тэксце № 1, указваюць словы *nar<u>y</u>kati* і *pr<u>y</u>chodit*, дзе літара *y* адпавядае гуку [ы]. Зычны [г] абазначаецца ў абодвух тэкстах літарай *h* або спалучэннем *ch* (два выпадкі ў тэксце № 2), што дазваляе лічыць гэты гук фрыкатыўным (або фарынгальным). Літара *g*, якой звычайна абазначаюць выбухны [г], не ўжыта ў творах ні разу.

Граматычныя асаблівасці. Сярод назоўнікаў у тэксце № 1 вылучаецца слова *lud<u>iu</u>m*. Як вынікае з кантэксту, гэта форма Д. або В. склону назоўніка *людзі*. У форме Р. або В. склону ўжыты і субстантываваны прыметнік *маладая*, які ў тэксце № 1 мае выгляд *molod<u>oij</u>*. У гэтым жа творы маюцца назоўнікі ў форме Кл. склону: *did<u>u</u>*, *brod<u>o</u>* (пры наяўнасці ў тым ліку формы Кл. склону *brod<u>a</u>*). Аднак найбольш адметныя ў тэксце № 1 дзеяслоўныя формы: інфінітывы *zabawlat<u>y</u>*, *weselyt<u>y</u>*, *stohnat<u>y</u>*, *wmyrat<u>y</u>* (пры наяўнасці разам з тым форм *narykat<u>i</u>*, *prochat<u>i</u>*); формы 2-й асобы адз. ліку заг. ладу – *lez*, *id*; форма 1-й асобы мн. ліку заг. ладу – *chodi<u>ma</u>*. У творах ужыты розныя формы дапаможнага дзеяслова *быць* пры ўтварэнні форм будучага часу: *budet* у тэксце № 1 і *bude* у тэксце № 2.

---

[5] Для зручнасці замест умоўных назваў тэксты будуць абазначацца нумарамі – № 1 (*Krasnaia uPani Uroda*) і № 2 (*Myleyka Swoho podkała*).

[6] З улікам ужывання ў польскай мове перыяду XVII–XVIII стст. дзеясловаў *pomagać* і *przeszkadzać* з галосным [а] у корані (*Elektroniczny słownik języka polskiego XVII i XVIII wieku*, n.d.), напісанне слоў *pomahaybak* і *pereskaźaiesz* у тэксце № 1 магло быць абумоўлена польскамоўным уплывам.

Маюць сваю спецыфіку формы займеннікаў: асабовыя *z¦namy* (Тв. склон ад *мы*), *ioy musz* (Р. склон ад *яна* з выражэннем прыналежнасці) у тэксце № 1, прыналежны *swoho* (Р. склон ад *свой*), асабовы *iey jmaie* (В. склон ад *яна*), зваротныя *sia* і *się* у тэксце № 2. Некаторыя службовыя словы таксама варта прыняць да ўвагі: злучнік *sczob* (тэкст № 1), часціцы *czy*, *wsze*, *nech* (тэкст № 2).

Лексічныя асаблівасці. Да ліку слоў, якія можна кваліфікаваць як адзінкі з абмежаваным пашырэннем на тэрыторыі сучаснай Беларусі (у тым ліку з-за іх адсутнасці ў лексічным фондзе сучаснай беларускай літаратурнай мовы), адносяцца наступныя:

prochati (тэкст № 1) – дзеяслоў у значэнні ‘прасіць’. Зафіксаваны на поўдні Беларусі (Крывіцкі, 1985, с. 230; Цыхун, 2005, с. 17), ужываўся ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове (Булыка, 2009, с. 271);

harast (тэкст № 2) – на тэрыторыі Беларусі лексема не зафіксавана (Мартынаў, 1991, с. 301), ужывалася ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове: *гораздъ*, *гараздъ* ‘добра, умела’, ‘якраз’ (Булыка, 1986, с. 66);

powernow (тэкст № 2) – у значэнні ‘вярнуцца’ ўжыванне дзеясловаў *павярнуць*, *павярнуцца* (і аднакарэнных утварэнняў) можна дапусціць для поўдня Беларусі (Крывіцкі, 1985, с. 71; Янкова, 1982, с. 228), аднак у XIX ст., мяркуючы па фіксацыі ў «Слоўніку беларускай мовы» І. І. Насовіча (Насовіч, 1983, с. 425), слова *павярнуць* з такім значэннем было вядома на большай тэрыторыі краіны.

Праекцыя моўных асаблівасцей тэкстаў на ўсходнеславянскі дыялектны ландшафт

Вылучаныя асаблівасці не дазваляюць адназначна акрэсліць моўную прыналежнасць тэкстаў «Красная ў пані ўрода» і «Мілейка свого подождала» з рукапісу XVIII ст., але ўказваюць хутчэй на ўсходнеславянскае паходжанне гэтых твораў пры заходнеславянскім (польскім) графічным афармленні. Разам з тым адсутнасць шэрагу адрознівальных рыс (Жураўскі & Крамко, 1972) дае падставы сцвярджаць, што мова гэтых тэкстаў не з’яўляецца старабеларускай літаратурна-пісьмовай, абодва творы дэманструюць жывую тагачасную мову часткі ўсходнеславянскага насельніцтва Рэчы Паспалітай. Больш дакладная моўна-тэрытарыяльная лакалізацыя з апорай на канкрэтныя населеныя пункты ўяўляецца даволі праблемнай.

Калі прыняць у якасці адпраўнога пункта аднясенне А. Мальдзісам тэкстаў № 1 і № 2 да беларускіх, то ў аснову прасторава-часавай праекцыі адлюстраваных у гэтых творах моўных асаблівасцей мэтазгодна пакласці дыялектны ландшафт у межах Беларусі. Так, па стане на сярэдзіну XX ст. адсутнасць акання ў першым і другім пераднаціскных складах была засведчана на поўдні краіны (Аванесаў і інш., 1963, кк. 1, 8), а ў паслянаціскным канцавым адкрытым складзе – на паўднёвым захадзе (Аванесаў і інш., 1963, к. 14). Той факт, што аканне прагрэсіруе (Янкоўскі, 1989, с. 122), дазваляе дапусціць для XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі не толькі наяўнасць саміх арэалаў з оканнем, але і крыху павялічаны іх памер у кірунках на поўнач і ўсход, дзе словы *bo̲ro̲da*, *u¦po̲koi*, *mo̲lo̲doho̲* (тэкст № 1), *swo̲ho*, *po̲wernow*, *sęrdenko̲* (тэкст № 2) і падобныя маглі быць цалкам натуральнымі. Меркаванне пра колішнюю распаўсюджанасць окання на тэрыторыі сучаснага паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы выказваў таксама В. Чэкмонас (Чекмонас, 2001, с. 34).

Падобная сітуацыя мае месца і ў выпадку з галоснымі гукамі на месцы былога *ѣ* пад націскам. Адлюстраванае ўжо ў пісьмовых помніках XIII–XIV стст. змяненне *ѣ* на *э(е)* пачалося ў гаворках на поўначы і паўночным захадзе сучаснай Беларусі і паступова пасоўвалася на поўдзень і паўднёвы захад (Янкоўскі, 1989, с. 117). З улікам стратыфікацыі розных вынікаў гэтага працэсу ў сярэдзіне XX ст. (напрыклад, Аванесаў і інш., 1963, к. 34) арэал з пераходам *ѣ* у [і] або [ы] (*di̲du*, *na¦bi̲du*, *z¦dy̲da* у тэксце № 1) у XVIII ст. таксама, хутчэй за ўсё, існаваў і быў, магчыма, нават большым па памерах, асабліва ўлічваючы наяўнасць як бы пераходных зон – з закрытым [э] і дыфтонгам [іэ]. Адзінкавыя прыклады пераходу этымалагічнага [о] у гук [у] пад націскам (*id na nu̲cz* у тэксце № 1) і замены этымалагічнага [ы] гукам [у] пасля губнога зычнага (*pozbu̲ła* у тэксце № 1) пры фіксацыі гэтых з'яў у сярэдзіне XX ст. (Аванесаў і інш., 1963, кк. 35, 39) нельга, відаць, лічыць выключэннямі і для гаворак XVIII ст. на поўдні сучаснай Беларусі.

Што датычыць адсутнасці адлюстравання ў абодвух творах дзекання і цекання (за выключэннем слова *powo̲dzyt* у тэксце № 2), то гэты факт пакуль не можа быць аднесены да ліку рэлевантных пры моўна-тэрытарыяльнай лакалізацыі. Звязана гэта з тым, што ў кірылічных помніках усходнеславянскага паходжання, створаных на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага і пазней Рэчы Паспалітай, дзеканне і цеканне (пры развіцці гэтых з'яў у беларускай мове не пазней як у XIV ст.) адлюстроўваліся

слаба (Янкоўскі, 1989, с. 127), а паўнавартасны аналіз тагачасных лацінаі арабаграфічных помнікаў усходнеславянскага паходжання з мэтай устанаўлення характэрных для XVI–XVIII стст. арэалаў дзекання і цекання не праводзіўся[7]. Іншымі словамі, адсутнасць адлюстравання гэтых з'яў не можа пакуль лічыцца дастатковай падставай для вывядзення адпаведных тэкстаў часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай за сучасныя межы асноўнага дыялектнага масіву беларускай мовы, якому дзеканне і цеканне ўласцівы сёння ў поўнай меры (Аванесаў і інш., 1963, к. 56).

Зацвярдзелы характар зычнага [р], пацверджаны двума прыкладамі з тэксту № 1 (*nar̲y̲kati* і *pr̲y̲chodit*), тэрытарыяльна ў XVIII ст. з'яўляўся, хутчэй за ўсё, шырока распаўсюджанай асаблівасцю ў межах сучаснай Беларусі. На гэта ўказвае, з аднаго боку, прыведзены В. Майсіенкам факт, што ўжо ў другой палове XVI стст. цвёрдасць [р] была характэрна для большасці беларускіх рэгіёнаў (Мойсієнко, 2016, с. 42), а з другога боку – засведчанае для большасці гаворак краіны неадрозніванне цвёрдасці-мяккасці [р] у сярэдзіне XX ст. (Аванесаў і інш., 1963, к. 42). Аналагічная сітуацыя мае месца таксама ў выпадку з зычным [г]: адлюстраваны ў тэкстах № 1 і № 2 невыбухны характар гэтага гука – даўняя асаблівасць дыялектнага ландшафту Беларусі (Янкоўскі, 1989, с. 129) і ў той жа час адметная рыса беларускіх гаворак на сучасным этапе (Чекмонас, 2001, с. 32). Адпаведна, і ў XVIII ст. зычны [г] на акрэсленай тэрыторыі мог быць выбухным толькі ў нешматлікіх запазычаных словах.

Форма назоўніка *lud̲i̲um*, ужытая ў тэксце № 1, не з'яўляецца тыповай. У агульнаўсходнеславянскай (старажытнарускай) мове слова *людзі* скланялася такім жа чынам, як і назоўнік *госці* (Горшкова & Хабургаев, 1981, с. 151; Янкоўскі, 1989, с. 153). Згодна з парадыгмай скланення, канчатак слова *ludium* не адпавядае канчаткам назоўніка *людие* ў формах Д. і В. склону (*-ьмъ*, *-и*). Не вядомы канчатак *-ium* (*-юм*) для форм Д. і В. склону множналікавых назоўнікаў і ў гаворках на тэрыторыі сучаснай Беларусі (Аванесаў, 1964, сс. 175–185). Усё гэта схіляе да высновы, што слова *ludium* у тэксце № 1 з'яўляецца вынікам апіскі (на месцы форм *ludiem* або *ludiom* ці нават слова *budiem*, якое падыходзіць па сэнсе).

[7] Тут будзе дарэчы прывесці выснову П. Вэкслера наконт таго, што цеканне і дзеканне развіліся, мабыць, на поўначы Беларусі паміж XIV і XVI стст. і пашырыліся на поўдзень краіны (Вэкслер, 2004, с. 228) і разам з тым асцярожнае меркаванне В. Чэкмонаса пра заходнія беларускія гаворкі як эпіцэнтр узнікнення дзекання і цекання і распаўсюджанне гэтых з'яў з паўднёвага захаду на ўсход і паўночны ўсход (Чекмонас, 2001, с. 39).

Ужыты ў тэксце № 1 субстантываваны прыметнік ж. роду *molodoij* можа быць інтэрпрэтаваны як форма Р. склону, бо канчатак *-ой* у такіх выпадках шырока выкарыстоўваўся ўжо ў жывой народнай мове старабеларускага перыяду (Булыка і інш., 1979, с. 151). Тым не менш пасля інфінітыва *weselyty* лагічней глядзелася б форма В. склону субстантываванага прыметніка. Гэтая неадпаведнасць скіроўвае ўвагу на засведчаныя для польскай мовы XVI–XVII стст. факты ўжывання ў падобных канструкцыях менавіта форм Р. склону назоўнікаў (Klemensiewicz і інш., 1964, с. 415), што дазваляе выказаць меркаванне пра адлюстраванне гэтай з'явы праз польскамоўны ўплыў і ў тэксце № 1.

Формы Кл. склону *didu* і *borodo* ў гэтым творы адпавядаюць сістэме скланення назоўнікаў як у агульнаўсходнеславянскай (старажытнарускай), так і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовах (Булыка і інш., 1979, сс. 57–60). Разам з тым няма падстаў адмаўляць іх прысутнасць у акрэслены перыяд і ў гаворках на частцы тэрыторыі сучаснай Беларусі, пра што сведчыць захаванне клічных форм з канчаткамі *-е(-а)*, *-у* ад назоўнікаў м. роду і з канчаткамі *-о*, *-е* ад назоўнікаў ж. роду на захадзе і паўднёвым захадзе краіны да сярэдзіны XX ст. (Аванесаў, 1964, с. 152).

Ужытыя ў тэксце № 1 інфінітыўныя формы *zabawlaty*, *weselyty*, *stohnaty*, *wmyraty* адметныя тым, што з'яўляюцца тыповымі для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы з яе інфінітывамі на *-ти*: *быти*, *жити*, *мовити*, *платити* і г. д. (Жураўскі & Крамко, 1972, с. 137). Выкарыстанне такіх форм у творы, напісаным на жывой тагачаснай мове часткі ўсходнеславянскага насельніцтва Рэчы Паспалітай, можа сведчыць, з аднаго боку, пра ўплыў літаратурна-пісьмовай мовы таго перыяду, а з другога – пра натуральнасць такіх інфінітываў для аўтара тэксту № 1, іх пашыранасць у гаворках адпаведных мясцовасцей у XVIII ст. На высокую верагоднасць апошняга ўказвае фіксацыя форм тыпу *бра́ты*, *жа́ты*, *ходы́ты*, *робы́ты* і пад. у гаворках Заходняга Палесся на тэрыторыі Беларусі нават у сярэдзіне XX ст. (Аванесаў, 1964, с. 247). Прычым адначасовае ўжыванне ў тэксце № 1 інфінітываў *narykati*, *prochati* дае падставу лічыць месцам складання твора ўскраіну арэала форм на *-ty*.

Формы дзеясловаў 2-й асобы адз. ліку заг. ладу *lez*, *id* (сучасныя нарматыўныя эквіваленты – *ляжы*, *ідзі*) у тэксце № 1 не з'яўляюцца характэрнымі для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы (Янкоўскі, 1989, с. 235). Не зафіксаваны такія формы ад дзеясловаў з нерухомым націскам на канчатку і ў беларускай дыялектнай мове сярэдзіны XX ст. (Аванесаў, 1964, с. 277).

Разам з тым тыповасць форм 2-й асобы адз. ліку заг. ладу без канчатка *-i* для польскай мовы ўжо з канца XVI ст. (Podlawska, 2003, с. 133) можа ўказваць на запазычаны характар слоў *lez*, *id* у тэксце № 1. Што датычыць формы дзеяслова 1-й асобы мн. ліку заг. ладу *chodima*, то яна тыповая і для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы, і для гаворак на паўднёвым захадзе Беларусі па стане на сярэдзіну XX ст. (Янкоўскі, 1989, с. 236–237; Аванесаў і інш., 1963, к. 169), а таму, хутчэй за ўсё, ужывалася і ў мове часткі ўсходнеславянскага насельніцтва Рэчы Паспалітай у XVIII ст.

Энклітычныя формы зваротнага займенніка *sia* і *się* у тэксце № 2 могуць быць ахарактарызаваны па-рознаму. Першая з іх сустракалася ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове (Янкоўскі, 1989, с. 171) і, магчыма, у частцы тагачасных гаворак на тэрыторыі сучаснай Беларусі, хоць пытанне пра пашырэнне кароткіх форм займеннікаў у жывой народнай мове старажытнасці застаецца спрэчным (Свістунова & Ціванова, 2018, с. 68). Другая энклітычная форма – з літарай *ę* ў сваім складзе – была ўжыта пад уплывам польскай мовы, для якой зваротны займеннік *się* характэрны здаўна (Podlawska, 2003, с. 107). Аналагічны ўплыў праявіўся і ва ўжытай у тэксце № 2 часціцы *nech*: у польскай мове яна ўзнікла ўжо ў XVI ст. (Podlawska, 2003, с. 133), для старабеларускай пісьменнасці характэрнай амаль не была (Булыка і інш., 1979, с. 279). Адваротная сітуацыя мае месца ў выпадку са злучнікам *sczob* (тэкст № 1) і часціцай *czy* (тэкст № 2). Абодва службовыя словы адзначаны ў *Гістарычным слоўніку беларускай мовы* (Булыка, 2016, с. 385, 2017, с. 217), а ў другой палове XX ст. былі адлюстраваны ў шэрагу дыялекталагічных выданняў: злучнік *шчоб* зафіксаваны на поўдні Беларусі (Крывіцкі, 1987, с. 333; Мацкевіч, 1986, с. 516; Янкова, 1982, с. 425), а часціца *чы* – пераважна ў гаворках Заходняга Палесся на тэрыторыі краіны (Аванесаў і інш., 1963, к. 226). Адпаведна, у некаторых рэгіёнах сучаснай Беларусі гэтыя службовыя словы ўжываліся, верагодна, і ў XVIII ст.

Заключэнне

Назваўшы тэксты песень «Красная ў пані ўрода» і «Мілейка свого подождала» з рукапісу XVIII ст. беларускімі, А. Мальдзіс, натуральна, не меў на ўвазе адпаведнасць гэтых твораў нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы (нават нягледзячы на наяўнасць у тэкстах некалькіх выпадкаў акання і аднаго выпадку з дзеканнем – адрознівальных рыс,

якія ўваходзяць у так званы «беларускі комплекс»). Менавіта такой, па меркаванні даследчыка, была жывая беларуская мова ў XVIII ст. Як паказаў праведзены вышэй аналіз моўных асаблівасцей абодвух тэкстаў, на паўднёвым захадзе сучаснай Беларусі тагачаснае мясцовае насельніцтва сапраўды магло размаўляць прыкладна так. Разам з тым падобны моўны ландшафт быў характэрны таксама для паўночнага захаду Украіны і суседніх рэгіёнаў Польшчы, таму называць прааналізаваныя творы толькі беларускімі ўсё ж некарэктна. Слушным у гэтых адносінах падаецца меркаванне польскай даследчыцы Б. Дзержаноўскай, якая лічыць немагчымым адназначнае акрэсленне, напрыклад, «рускіх» тэкстаў з рукапісу XVII–XVIII стст. пад умоўнай назвай *Zbiór wierszy polskich i ruskich* толькі як беларускіх, украінскіх або польскіх з пункту гледжання іх моўнай прыналежнасці (Dzierżanowska, 2020, с. 285). Тым не менш у выпадку з разгледжанымі творамі *Krasnaia uPani Uroda* і *Myleyka Swoho podkała* іх мова можа быць ахарактарызавана хутчэй не як «polsko-ruska» («польска-ўсходнеславянская») (Dzierżanowska, 2020, с. 279), а як «беларуска-ўкраінская» ці, дакладней, мова пэўнай часткі ўсходнеславянскага насельніцтва Рэчы Паспалітай XVIII ст. Не з'яўляючыся старабеларускай літаратурна-пісьмовай, гэтая мова, відаць, не можа быць адназначна акрэслена і як «ruska», то-бок афіцыйная дзяржаўная мова Вялікага Княства Літоўскага (Citko, 2018, с. 7).

Два тэксты з рукапісу № 85 (сс. 240–242) з фондаў Бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта

Тэксты прыведзены з максімальным захаваннем графіка-арфаграфічных і пунктуацыйных асаблівасцей рукапісных арыгіналаў. Для ўмоўнага адасаблення распазнаных прыназоўнікаў, злучнікаў і часціц выкарыстаны знак «¦», які ў рукапісных арыгіналах адсутнічае.

Krasnaia u¦Pani Uroda. Horoszaia Mołoda:
A ioy musz Star nedusz chodima do chaty
Sczob wesoła Pani była ludium zabawlaty
Pomahaybak boroda
A hde zonka mołoda
Lez tycho nalicho bo¦welmi Stohnaiesz

Wesełyty Mołodoij nam pereskaźaiesz
Koli choczesz Stohnaty
Wydy Stary ze¦chaty
Didu procz id na nucz borodo Sywaia
A tud z¦namy twoia zonka budet weseł̊aia
U¦pokoi wmyraty
Budesz Borodaty
Tam Didu na¦bidu budesz narykati[8]
My za¦twoiu duszu budem Boha prochati
Z¦Dyda dusza Wychodit
Krasna zonka prychodit
Zdorowa Udowa pozbuła Staroho
Luby¦sz teper mołodoia[9] mėnė̀ molodoho

* * *

Myleyka Swoho podkała[10]
Czołom, czy, zdorow pytała
Czy dorozeyka ne¦szkodyt
Czy harast sia powodzyt
Mili Miłuiu Witaie
Za ruczku iey Jmaie
J kazet W¦tye Słowa
Ja zdorow kolis zdorowa
Ja zdorowaia wsze budu
Tuhy y¦Smutku zabudu
Kołys powernow Miłenki
Z¦dalekoy dorozenki
Chody Sęrdenko Luboie
Utyszymo się oboie
Nech do Samoho porocha
Bude Sczasnaia dorocha.

[8] Паводле рукапісу, апошняя літара ў слове *narykati* можа быць расчытана і як «у».

[9] З-за памаркі ў рукапісе трэцяя літара «о» ў слове *mołodoia* можа быць расчытана і як «а».

[10] З кантэксту вынікае, што ў слове *podkała*, магчыма, прапушчана першая літара: *ṡpodkała*.

Бібліяграфія

Аванесаў, Р. І. (Ed.). (1964). *Нарысы па беларускай дыялекталогіі*. Навука і тэхніка.

Аванесаў, Р. І., Крапіва, К. К., & Мацкевіч, Ю. Ф. (Eds.). (1963). *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы*. Выдавецтва Акадэміі навук БССР.

Брыль, А. Ф. (2020). Барунскія святочныя маналогі: Беларускія вершы сярэдзіны XVIII ст. у базыльянскім рукапісе. *Роднае слова*, *3*, 11–13.

Булыка, А. М. (Ed.). (1986). *Гістарычны слоўнік беларускай мовы* (Vol. 7). Навука і тэхніка.

Булыка, А. М. (Ed.). (2009). *Гістарычны слоўнік беларускай мовы* (Vol. 29). Беларуская навука.

Булыка, А. М. (Ed.). (2016). *Гістарычны слоўнік беларускай мовы* (Vol. 36). Беларуская навука.

Булыка, А. М. (Ed.). (2017). *Гістарычны слоўнік беларускай мовы* (Vol. 37). Беларуская навука.

Булыка, А. М., Жураўскі, А. І., & Крамко, І. І. (1979). *Гістарычная марфалогія беларускай мовы*. Навука і тэхніка.

Вэкслер, П. (2004). *Гістарычная фаналогія беларускае мовы*. Выдавец І. П. Логвінаў.

Гілевіч, Н. (Ed.). (1993). *Анталогія беларускай паэзіі* (Vol. 1). Мастацкая літаратура.

Горшкова, К. В., & Хабургаев, Г. А. (1981). *Историческая грамматика русского языка*. Высшая школа.

Жураўскі, А. І., & Крамко, І. І. (1972). Важнейшыя адрозненні паміж новай і старой беларускай літаратурнай мовай. In М. Р. Суднік (Ed.), *Беларускае і славянскае мовазнаўства* (pp. 132–147). Навука і тэхніка.

Крывіцкі, А. А. (Ed.). (1985). *Тураўскі слоўнік* (Vol. 4). Навука і тэхніка.

Крывіцкі, А. А. (Ed.). (1987). *Тураўскі слоўнік* (Vol. 5). Навука і тэхніка.

Лісейчыкаў, Д. (2016). «Poneże Swiaty Sobor Zamoyski krypko poweliwait…»: Сфальсіфікаваная візіта царквы ў в. Дзмітравічы Аршанскага павета Вялікага Княства Літоўскага 1621 г. *Архіварыус*, *14*, 158–174.

Мальдзіс, А. І. (1980). *На скрыжаванні славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII–XVIII ст.)*. Навука і тэхніка.

Мартынаў, В. У. (Ed.). (1991). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы* (Vol. 7). Навука і тэхніка.

Мартысюк, В. (2016). Дзве вершаваныя сатыры з XVIII стагоддзя. *Acta Albaruthenica*, *16*, 307–309.

Мацкевіч, Ю. Ф. (Ed.). (1986). *Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча* (Vol. 5). Навука і тэхніка.

Мойсієнко, В. (2016). *Історична діалектологія української мови: Північне (поліське) наріччя*. ВЦ «Академія».

Насовіч, І. І. (1983). *Слоўнік беларускай мовы*. БелСЭ.

Свістунова, М. (2020). Да праблемы пераемнасці беларускай літаратурнай мовы: Лацінаграфічныя тэксты XVIII стагоддзя, *Acta Albaruthenica*, *20*, 239–253. https://albaruthenica.uw.edu.pl/wp-content/uploads/sites/210/2024/02/16_Swistunowa.pdf

Свістунова, М. І., & Ціванова, Г. К. (2018). *Гістарычная марфалогія беларускай мовы*. БДУ.

Хаўстовіч, М. (2022). Малавядомы рукапіс XVIII стагоддзя. *Acta Albaruthenica*, *22*, 339–347. https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.22.21

Цыхун, Г. А. (Ed.). (2005). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы* (Vol. 10). Беларуская навука.

Чамярыцкі, В. А. (Ed.). (2005). *Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя* (2nd ed.). Беларуская навука.

Чамярыцкі, В. А. (Ed.). (2012). *Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў*. Мастацкая літаратура.

Чекмонас, В. (2001). Из истории формирования белорусских говоров. In Г. Цыхун (Ed.), *Беларуская мова: Шляхі развіцця, кантакты, перспектывы* (pp. 29–46). Беларускі кнігазбор.

Янкова, Т. С. (1982). *Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны*. Навука і тэхніка.

Янкоўскі, Ф. М. (1989). *Гістарычная граматыка беларускай мовы* (3rd ed.). Вышэйшая школа.

Akta i korespondencja obozu saskiego i opozycji w Polsce w latach 1702–1704 oraz miscellanea XVII i XVIII w. [Manuscript]. (n.d.). Biblioteka Uniwersytetu Warszawskiego, Warszawa.

Citko, L. (Ed.). (2018). *Języki ruskie w rozwoju historycznym i kontaktach z polszczyzną*. Wydawnictwo PRYMAT.

Dzierżanowska, B. (2020). Czy pieśń ruska jest białoruska? O zapomnianym zjawisku literackim polsko-ruskiego pogranicza w XVII–XVIII w. In M. Chaustowicz & R. Kaleta (Eds.), *Język, literatura i kultura Białorusi na przestrzeni wieków* (pp. 279–288). SOWA.

Elektroniczny słownik języka polskiego XVII i XVIII wieku. (n.d.). Instytut Języka Polskiego PAN. Retrieved March 1, 2024, from https://sxvii.pl/

Getka, J. (2018). Белорусский язык XVIII в. – исследовательские постулаты. *Studia Białorutenistyczne*, *12*, 177–190. https://doi.org/10.17951/sb.2018.12.177-190

Klemensiewicz, Z., Lehr-Spławiński, T., & Urbańczyk, S. (1964). *Gramatyka historyczna języka polskiego*. Państwowe wydawnictwo naukowe.

Kozerska, H., & Stummer, W. (Opr.) (1963). *Katalog rękopisów Biblioteki Uniwersyteckiej w Warszawie* (Vol. 1, Nr 1–262). Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.

Podlawska, D. (2003). *Gramatyka historyczna języka polskiego z elementami gramatyki języka staro-cerkiewno-słowiańskiego i dialektologii*. Wydawnictwo Pomorskiej Akademii Pedagogicznej w Słupsku.

Polański, K. (Ed.). (1995). *Encyklopedia językoznawstwa ogólnego*. Zakład Narodowy im. Ossolińskich – Wydawnictwo.

Bibliography (Transliteration)

Akta i korespondencja obozu saskiego i opozycji w Polsce w latach 1702–1704 oraz miscellanea XVII i XVIII w. [Manuscript]. (n.d.). Biblioteka Uniwersytetu Warszawskiego, Warszawa.

Avanesaŭ, R. I. (Ed.). (1964). *Narysy pa belaruskaĭ dyialektalohii*. Navuka i tėkhnika.

Avanesaŭ, R. I., Krapiva, K. K., & Matskevich IU. F. (Eds.). (1963). *Dyialektalahichny atlas belaruskaĭ movy*. Vydavetstva Akadėmii navuk BSSR.

Bryl′, A. F. (2020). Barunskiia sviatochnyia manalohi: Belaruskiia vershy siarėdziny XVIII st. u bazyl'ianskim rukapise. *Rodnae slova*, *3*, 11–13.

Bulyka, A. M. (Ed.). (1986). *Histarychny sloŭnik belaruskaĭ movy* (Vol. 7). Navuka i tėkhnika.

Bulyka, A. M. (Ed.). (2009). *Histarychny sloŭnik belaruskaĭ movy* (Vol. 29). Belaruskaia navuka.

Bulyka, A. M. (Ed.). (2016). *Histarychny sloŭnik belaruskaĭ movy* (Vol. 36). Belaruskaia navuka.

Bulyka, A. M. (Ed.). (2017). *Histarychny sloŭnik belaruskaĭ movy* (Vol. 37). Belaruskaia navuka.

Bulyka, A. M., Zhuraŭski, A. I., & Kramko, I. I. (1979). *Histarychnaia marfalohiia belaruskaĭ movy*. Navuka i tėkhnika.

Chamiarytski, V. A. (Ed.). (2005). *Antalohiia daŭniaĭ belaruskaĭ litaratury: XI – pershaia palova XVIII stahoddzia* (2nd ed.). Belaruskaia navuka.

Chamiarytski, V. A. (Ed.). (2012). *Litaratura XVII–XVIII stahoddziaŭ*. Mastatskaia litaratura.

Chėkmonas, V. (2001). Iz istorii formirovaniia belorusskikh hovorov. In H. Tsykhun (Ed.), *Belaruskaia mova: Shliakhi razvitstsia, kantakty, perspektyvy* (pp. 29–46). Belaruski knihazbor.

Citko, L. (Ed.). (2018). *Języki ruskie w rozwoju historycznym i kontaktach z polszczyzną*. Wydawnictwo PRYMAT.

Dzierżanowska, B. (2020). Czy pieśń ruska jest białoruska? O zapomnianym zjawisku literackim polsko-ruskiego pogranicza w XVII–XVIII w. In M. Chaustowicz & R. Kaleta (Eds.), *Język, literatura i kultura Białorusi na przestrzeni wieków* (pp. 279–288). SOWA.

Elektroniczny słownik języka polskiego XVII i XVIII wieku. (n.d.). Instytut Języka Polskiego PAN. Retrieved March 1, 2024, from https://sxvii.pl/

Getka, J. (2018). Belorusskiĭ iazyk XVIII v. – issledovatel′skie postulaty. *Studia Białorutenistyczne*, *12*, 177–190. https://doi.org/10.17951/sb.2018.12.177-190

Gorshkova, K. V., & Khaburgaev, H. A. (1981). *Istoricheskaia grammatika russkogo iazyka*. Vysshaia shkola.

Hilevich, N. (Ed.). (1993). *Antalohiia belaruskaĭ paėzii* (Vol. 1). Mastatskaia litaratura.

IAankova, T. S. (1982). *Dyialektny sloŭnik Loeŭshchyny*. Navuka i tėkhnika.

IAnkoŭski, F. M. (1989). *Histarychnaia hramatyka belaruskaĭ movy* (3rd ed.). Vyshėĭshaia shkola.

Khaŭstovich, M. (2022). Malaviadomy rukapis XVIII stahoddzia. Acta *Albaruthenica*, *22*, 339–347. https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.22.21

Klemensiewicz, Z., Lehr-Spławiński, T., & Urbańczyk, S. (1964). *Gramatyka historyczna języka polskiego*. Państwowe wydawnictwo naukowe.

Kozerska, H., & Stummer, W. (Comp.) (1963). *Katalog rękopisów Biblioteki Uniwersyteckiej w Warszawie* (Vol. 1, Nr 1–262). Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.

Kryvitski, A. A. (Ed.). (1985). *Turaŭski sloŭnik* (Vol. 4). Navuka i tėkhnika.

Kryvitski, A. A. (Ed.). (1987). *Turaŭski sloŭnik* (Vol. 5). Navuka i tėkhnika.

Liseĭchykaŭ, D. (2016). "Poneže Swiaty Sobor Zamoyski krypko poweliwait…": Sfal'sifikavanaia vizita tsarkvy ŭ v. Dzmitravichy Arshanskaha paveta Vialikaha Kniastva Litoŭskaha 1621 h. *Arkhivaryus*, *14*, 158–174.

Mal′dzis, A. I. (1980). *Na skryzhavanni slavianskikh tradytsyĭ. Litaratura Belarusi perakhodnaha peryiadu (druhaia palavina XVII–XVIII st.)*. Navuka i tėkhnika.

Martynaŭ, V. U. (Ed.). (1991). *Ėtymalahichny sloŭnik belaruskaĭ movy* (Vol. 7). Navuka i tėkhnika.

Martysiuk, V. (2016). Dzve vershavanyia satyry z XVIII stahoddzia. *Acta Albaruthenica*, *16*, 307–309.

Matskevich, IU. F. (Ed.). (1986). *Sloŭnik belaruskikh havorak paŭnochna-zakhodniaĭ Belarusi i iae pahranichcha* (Vol. 5). Navuka i tėkhnika.

Moĭsienko, V. (2016). *Istorichna dialektolohiia ukraïns'koï movi: Pivnichne (polis'ke) narichchia*. VC „Akademiia".

Nasovich, I. I. (1983). *Sloŭnik belaruskaĭ movy*. BelSĖ.

Podlawska, D. (2003). *Gramatyka historyczna języka polskiego z elementami gramatyki języka staro-cerkiewno-słowiańskiego i dialektologii*. Wydawnictwo Pomorskiej Akademii Pedagogicznej w Słupsku.

Polański, K. (Ed.). (1995). *Encyklopedia językoznawstwa ogólnego*. Zakład Narodowy im. Ossolińskich.

Svistunova, M. (2020). Da prablemy peraemnastsi belaruskaĭ litaraturnaĭ movy: latsinahrafichnyia tėksty XVIII stahoddzia, *Acta Albaruthenica*, *20*, 239–253. https://albaruthenica.uw.edu.pl/wp-content/uploads/sites/210/2024/02/16_Swistunowa.pdf

Svistunova, M. I., & Tsivanova, H. K. (2018). *Histarychnaia marfalohiia belaruskaĭ movy*. BDU.

Tsykhun, H. A. (Ed.). (2005). *Ėtymalahichny sloŭnik belaruskaĭ movy* (Vol. 10). Belaruskaia navuka.

Vėksler, P. (2004). *Histarychnaia fanalohiia belaruskae movy*. Vydavets I. P. Lohvinaŭ.

Zhuraŭski, A. I., & Kramko, I. I. (1972). Vazhneĭshyia adroznenni pamizh novaĭ i staroĭ belaruskaĭ litaraturnaĭ movaĭ. In M. R. Sudnik (Ed.), *Belaruskae i slavianskae movaznaŭstva* (pp. 132–147). Navuka i tėkhnika.

Two Little-Known Texts Written in the Latin Alphabet in an Eighteenth-Century Manuscript: An Attempt at Locating Them in the Dialectal Landscape of the Eastern Part of the Polish-Lithuanian Commonwealth

Summary

The article analyses a number of linguistic features of two little-known texts in the Latin alphabet under the conventional titles *Krasnaia uPani Uroda* and *Myleyka Swoho podkała*, which are contained in an eighteenth-century manuscript from the collection of the Warsaw University Library. In one of his monographs, the Belarusian researcher Adam Mal′dzis characterised these texts as Belarusian, but in a description of the manuscript in a Polish reference book they appear as *ruskie* 'Ruthenian'. The analysis of phonetic, grammatical and lexical features has shown that the texts under study could have been created in the south-western part of modern Belarus. However, it cannot be excluded that they originated in the north-west of modern Ukraine or in the neighbouring regions of Poland. This allows us to argue that the analysed texts were created in one of the territorial varieties of the language of the East Slavic population of the Polish-Lithuanian Commonwealth.

Dwa mało znane teksty pisane alfabetem łacińskim w XVIII-wiecznym rękopisie: próba ich językowego przyporządkowania do dialektalnego krajobrazu wschodniej części Rzeczypospolitej Obojga Narodów

Streszczenie

W artykule przeanalizowano szereg cech językowych dwóch mało znanych, zapisanych alfabetem łacińskim tekstów pod umownymi tytułami *Krasnaia u Pani Uroda* i *Myleyka Swoho podkała*, które znajdują się w osiemnastowiecznym rękopisie ze zbiorów Biblioteki Uniwersyteckiej w Warszawie. W jednej

ze swoich monografii białoruski badacz Adam Maldzis scharakteryzował te teksty jako białoruskie, ale w opisie rękopisu w jednym z polskich przewodników figurują one jako ruskie. Analiza cech fonetycznych, gramatycznych i leksykalnych wykazała, że teksty te rzeczywiście mogły powstać w południowo-zachodniej części współczesnej Białorusi, nie można jednak wykluczyć, że pochodziły z północno-zachodniej części współczesnej Ukrainy lub z sąsiednich regionów Polski. Pozwala to twierdzić, że analizowane teksty powstały w jednej z odmian terytorialnych języka ludności wschodniosłowiańskiej Rzeczypospolitej Obojga Narodów.

Keywords: Belarusian language; East Slavic dialects; Polish-Lithuanian Commonwealth

Słowa kluczowe: język białoruski; gwary wschodniosłowiańskie; Rzeczpospolita Obojga Narodów

Vadzim Shkliaryk, Institute of Slavic Studies, Polish Academy of Sciences, Warsaw, Poland
ORCID: https://orcid.org/0009-0004-7354-9747
Correspondence: vadzim.shkliaryk@gmail.com

The preparation of this article was carried out under a scholarship from the Polish National Agency for Academic Exchange.

Competing interests: The author has declared that he has no competing interests.



Publication history: Received: 2024-03-13; Accepted: 2024-05-20; Published: 2024-12-24